З новым навучальным годам, дарагія сябры!

Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 20 (298) | Панядзелак, 2 верасня 1957 года | Цана 20 кап.

ВЕДЫ—ЗБРОЯ

Бязмежна вялікае значэнне навукі у жыцці і развіцці чалавечага грамадства. Ва ўсёй шматгранай дзейнасці чалавека няма такога участка, дзе веды, навука не адыгрывалі-б важнейшай стваральнай ролі. З таго часу, як першыя проблескі розуму узнялі чалавека над узроўнем жывёл, пачауся працэс накаплення ведаў аб уласцівасцях акружаючага свету. Веды гэтыя перадаваліся ад пакалення да пакалення, аб'ём і глыбіня іх няўхільна расли. Гэты працэс развіцця пазнання ішоў спачатку марудна. Але праходзілі стагоддзі, і навука развівалася усё хутчэй і хутчэй. Апошнія стагоддзі характарызуюцца надзвычай хуткім развіццём навукі. Многія сотні тысяч людзей ва усім свеце уцягваюцца ў яе арбіту. Агульная сума ведаў, накопленых чалавецтвам за яго гісторыю, неймаверна вялікая. Зафіксираваная у мільёнах кніг, яна прадстауляе сабой каштоунейшы здабытак чалавечага грамадства.

Магутнасць навукі не ведае граніц як у галіне пазнання таямніц прыроды, так і у раскрыцці законау развіцця чалавечага грамадства. Непераможная марксісцка-ленінская тэорыя, авалодаушы масамі, змяніла ход навейшай гісторыі. 40 год назад партыя большэвікоу, узброеная гэтай тэорыяй, дабілася у нашай краіне ў дні Кастрычніка сусветна-гістарычнай перамогі.

Звяртаючыся да навук аб прыродзе, мы бачым, што у апошнія дзесяцігоддзі у выніку поспеху, перш за усё фізікі, чалавек атрымау у сваё распараджэнне сапрауды фантастычныя магчымасці. Зараз, калі мы трывала уступілі у эпоху атамнай энергіі, цяжка нават паверыць, што менш 15 год назад практычнае выкарыстанне гэтай гіганцкай сілы прыроды здавалася амаль недасягальнай марай. Усяго 5 год назад вучоныя яшчэ не ведали, ці можна штучна ажыццявіць тэрмаядзерную рэакцыю, а зараз яны ужо прыступілі да рашэння задачы кіравання такой рэакцыяй, што дасць новую невычарпальную крыніцу энергіі. Менш 15 год назад хугчэйшыя вінтаматорныя самалёты не маглі дасягнуць і двух трэцей хуткасці гука, а сучасныя рэактыуныя самалёты пераузыходзяць яе у дватры разы. Совецкі самалёт ТУ-104 за некалькі гадзін дастауляе пасажырау з Масквы у Пекін. Але ёсць у нас і больш магутныя самалёты. Ракеты за некалькі дзесяткау мінут пралятаюць тысячы кілометрау, падымаючыся на сотні кілометрау увышыню, і дазваляюць пазнаць уласцівасці верхніх слаёу атмасферы. Праз некалькі месяцаў над нашай планетай з'явяцца штучныя спадарожнікі, да запуску якіх рыхтуюцца СССР і ЗША. Біёлагі у таварыстве з вучонымі другіх спецыяльнасцяу узмоцнена ідуць да вырашэння найвялікшай праблемы узнікнення жыцця на зямлі. Электронныя вылічальныя машыны за некалькі мінут робяць аб'ём вылічэння, над якім цэлая армія людзей павінна была-б працаваць некалькі год.

Гэтыя прыклады толькі у невялікай ступені раскрываюць грандыёзныя магчымасці навукі і тэхнікі, сілу сучасных ведаў. Вялікае задавальненне выклікае той факт, што совецкая навука займае адно з першых месц у свеце. У нашай краіне магчымасць дасягнуць найвышэйшых вышынь ведаў прадастаулена усім без выключэння, хто валодае здольнасцямі. Сотні вышэйшых навучальных установу розных спецыяльнасцяу, інтэрнаты, стыпендыі, высокакваліфікаваныя навукова-выкладчыцкія кадры, шматлікія аудыторыі, лабараторыі з сучасным абсталяваннем—усё гэта прадастауляецца Совецкай дзяржавай у распараджэнне маладых людзей, якія імкнуцца да ведау. Цаніце гэта, маладыя сябры! І няхай ваша паспяховая вучоба будзе адказам на вялікія клопаты Радзімы!

Ф. І. ФЁДАРАЎ,
прафесар, доктар матэматычных навук, член-карэспандэнт АН БССР

ТАВАРЫШЫ СТУДЭНТЫ!

Рэктарат Беларускага дзяржаунага універсітэта імя В. І. Леніна горача віншуе студэнтау з новым навучальным годам!

Дарагія таварышы студэнты! Новы навучальны год пачынаецца у шчаслівы час, калі ўся наша краіна знаходзіцца у росквіце сваіх невычарпальных творчых сіл і пад кіраўніцтвам слаунай Комуністычнай партыі з поспехам пераутварае у жыццё вялікую праграму комуністычнага будаўніцтва.

XX з'езд КПСС паставіу перад совецкай вышэйшай школай, як галоуную задачу, паляпшэнне якасці падрыхтоукі спецыялістау на аснове цеснай суязі вучобы з вытворчасцю. Наш універсітэт распалагае усімі магчымасцямі для паспяховага рашэння гэтай задачы.

Калектыу БДУ мае высокакваліфікаваныя кадры навуковых работнікау і вялікі вопыт у падрыхтоуцы спецыялістау. У гэтых умовах поспех у вучобе галоуным чынам залежыць ад саміх студэнтау, ад іх арганізаванасці, сістэматычнай упартай самастойнай працы. Паспяховая падрыхтоука спецыялістау у совецкай вышэйшай школе патрабуе выхавання у студэнтау свядомай дысцыпліны, працавітасці, сумленнасці і праудзівасці—усіх высокіх якасцей, уласцівых людзям комуністычнай маралі.

У наш калектыу улілося новае папауненне студэнтау—першакурснікі. Мы выражаем цвёрдую упэуненасць у тым, што яны паспяхова выкарыстаюць адкрыушыяся для іх шырокія магчымасці і з вялікім натхненнем будуць ажыццяўляць свае высокародныя ілюзіі. Мы верым, да ведау, да творчай працы на карысць Радзімы.

За час вучобы у ВНУ студэнты павінны прывіць сабе практычныя навыкі для грамадскай дзейнасці, каб стаць свядомымі і актыунымі ўдзельнікамі комуністычнага будаўніцтва. Гэты вопыт і навыкі могуць быць набыты толькі пры самым актыуным удзеле студэнтау ва усім грамадскім жыцці ВНУ.

Рэктарат выражае упэуненасць у тым, што калектыу універсітэта зробіць усё неабходнае для паспяховай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістау, і разам з тым прасякнут надзеяй, што усе студэнты БДУ з гонарам выканаюць свои абавязак, будуць захоуваць і развіваць лепшыя традыцыі Беларускага універсітэта.

Рэктарат БДУ.

ТЭЛЕГРАМА

МАРЫНАЎКІ АКМОЛІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ | МІНСК БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ КАМІТЭТ КО МСАМОЛА

ВІНШУЕМ УСІХ АСАБЛІВА ПЕРШАКУРСНІКАЎ ПАЧАТКАМ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ЖАДАЕМ ПОСПЕХАЎ—ЦАЛІННІКІ—



ДЗЕНЬ ДОБРЫ, УНІВЕРСІТЭТ!

Фото М. Пільшчыкава.

З ПАЧАТКАМ ЗАНЯТКАЎ, ПЕРШАКУРСНІКІ!

Новы атрад найбольш здольных і таленавітых юнакоў і дзяўчат прыйшоў сёння на І курс біялагічнага факультэта. Трэба прама сказаць, што заваяваць права быць студэнтамі біялагічнага факультэта змаглі толькі тыя, хто ўпарта авалодваў асновамі навук і паказаў глыбокія асэнсаваныя веды на ўступных экзаменах. Але стаць студэнтам універсітэта—гэта толькі пачатак вялікай справы. Наперадзе пяць год упартай напружанай працы і актыўнага творчага жыцця, наперадзе—лекцыі, практыкумы, семінары, экзамены.

З кожным годам прад'яўляюцца усё больш павышаныя патрабаванні да ведаў студэнтаў. Для таго, каб быць на узроўні сучасных патрабаванняў да біялагічнай навукі, неабходна добра авалодаць сумежнымі навукамі—хіміяй, фізікай, вышэйшай матэматыкай і іншымі. Не выпадкова таму, што у гэтым навучальным годзе для студэнтаў-біёлагаў уводзяцца новыя курсы — біяфізіка, радыёбіялогія, электрафізіялогія і інш. Таму неабходна не толькі пажадаць, але і патрабаваць ад нашых першакурснікаў з першага-жодня, не губляючы ні адной хвіліны, пачаць у поўную меру сваіх сіл і магчымасцей асваенне вывучаемых курсаў і разам з усімі старшымі таварышамі ўключыцца у навуковую працу, якая вядзецца на нашых кафедрах.

Наш народ ганарыцца сваёй навукай, сваімі вучонымі. Нас радуе паведамленне ТАСС аб тым, што упершыню у свеце нашы вучоныя вынайшлі і паспяхова правялі выпрабаванне паміжканцінентальнай балістычнай ракеты, нас радуе паспяхова праведзены у Маскве у жніўні гэтага года міжнародны сімпозіум па пытаннях узнікнення жыцця на зямлі і тое, што на гэтай нарадзе вядучая роля належала савецкім вучоным, а наш паважаны акадэмік Т. Н. Годнеў паспяхова выступіў там з дакладам, які атрымаў высокую ацэнку.

Хацелася-б пажадаць нашым студэнтам, каб яны хутчэй зразумелі бязмежную радасць работнікаў і студэнтаў універсітэта ўсім тым, што робіцца у нашай краіне, у нашым універсітэце, каб яны хутка і смела уключыліся у творчую працу ўсяго калектыву і разам з ім перанасілі і прадстаячыя цяжкасці і раздзялялі радасць дасягнутых поспехаў.

П. Г. ПЯТРОВІЧ,
дэкан біялагічнага факультэта.

* * *

З новым прыёмам студэнтаў ва універсітэт уліваюцца маладыя сілы, каб памножыць рады ўзброеных перадавой навукай змагароў за пабудову камунізма. Няма сумнення, што новыя рады моладзі будуць імкнуцца авалодаць навуковымі метадамі пазнання, асновываючыся на прынцыпах дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма.

Ад кожнага студэнта на працягу усяго універсітэцкага курса патрабуецца адначасовае спалучэнне спецыяльнай падрыхтоўкі і грамадскай работы. Гэтыя якасці неабходны для спецыялістаў, якія ідэйна-б сябе на любым участку практычнай дзейнасці.

Да студэнтаў першых курсаў, таксама як і да студэнтаў старшых курсаў, прад'яўляюцца наступныя асноўныя патрабаванні: добрасумленныя адносіны да вучобы, сістэматычная праца над сабой, любоў да сваёй спецыяльнасці, выкананне элементарных умоў дысцыпліны. Студэнты павінны прымаць актыўны удзел у грамадскіх мерапрыемствах, праяўляюць цікавасць да самастойнай навукова-даследчай працы праз спецыяльныя студэнцкія гуртки. Студэнт павінен выхоўваць у сябе высокія маральныя якасці.

Дэканат геолага-геаграфічнага факультэта віншуе першакурснікаў з пачаткам новага навучальнага года.

О. Н. АНДРУШЧАНКА,
дэкан геолага-геаграфічнага факультэта.

КЛІЧАМ ВАС, СЯБРЫ!

НЯХАЙ РАСЦЕ НАША СЯМ'Я КОМСАМОЛЬСКАЯ!

У вялікую і дружную трохтысячную сям'ю комсамольцаў універсітэта сёння ўліўся новы атрад моладзі—нашы першакурснікі. Рознымі шляхамі прыйшлі яны у ВНУ, абралі розныя спецыяльнасці. Але іх аб'ядноўвае тое, што яны поўныя рашучасці і імкненняў вучыцца, вучыцца настойліва і ўпарта, каб стаць сапраўднымі спецыялістамі, якім праз пяць год, пасля заканчэння ВНУ, не спатрэбяцца няньки і апякуны у жыцці.

Але каб стаць добрым спецыялістам мала ведаў, атрыманых ва аўдыторыях і лабараторыях. Гэтыя веды павінны быць замацаваны практыкай жыцця. А для студэнта гэта значыць актыўна удзельнічаць у грамадскай рабоце, часцей бываць у нашых падшэфных калгасах, школах і прадпрыемствах.

Шматгранныя формы работы нашай комсамольскай арганізацыі. Комсамольцы БДУ дапамагаюць рабочым падшэфных прадпрыемстваў—Мінскага аўтамабільнага завода, станкабудаўнічага завода імя Кірава, будаўнічага трэста № 136 і іншых займаецца у вячэрніх школах і тэхнікумах, рыхтавацца да паступлення у ВНУ; студэнты выступаюць з лекцыямі і дакладамі на прадпрыемствах Мінска, выязджаюць у калгасы падшэфнага Дзяржынскага раёна з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, дапамагаюць калгаснікам убіраць ураджай. Другі год падрад комсамольцы універсітэта выязджаюць на уборку ўраджаю на цалінныя землі Казахстана. Зараз у Акмолінскай і Какчэтаускай вобласцях Казахскай ССР убіраюць цалінны ураджай звыш 500 студэнтаў БДУ.

Мы ўпэўнены, што першакурснікі з першых дзён вучобы ва універсітэце актыўна уключацца у грамадскую работу. Толькі у сумеснай працы і вучобе ствараюцца моцныя, згуртаваныя калектывы, якія так патрэбны ў студэнцкім жыцці, асабліва у жыцці студэнтаў першых курсаў. Першакурснікам у ближэйшы час прадстаіць абіраць комсамольскія курсавыя і групавыя бюро. Трэба, каб да кіраўніцтва гэтымі бюро прыйшлі ініцыятыўныя, энергічныя юнакі і дзяўчаты, здольныя згуртаваць комсамольцаў для выражэння вялікіх і адказных задач, якія стаяць перад студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў.

Дарагія сябры першакурснікі! Мы, вашы старэйшыя таварышы, вітаем вас з уступленнем у дружную сям'ю комсамольцаў БДУ і жадаем вялікіх поспехаў у вучобе і грамадскай дзейнасці.

Е. БАБОСАЎ,
сакратар камітэта комсамола БДУ.

ПЕРШАКУРСНІЦЫ З ГРОДЗЕНШЧЫНЫ



Фота М. Пільшчыкава.

Гэтыя дзяўчыны, якіх вы бачыце на фотаздымку, ніколі не ведалі адна другую. Жылі яны усе ў адной вобласці — Гродзенскай. Тамара Кузняцова—выпускніца 9 сярэдняй школы горада Гродна, Марыя Журовіч закончыла Азерніцкую сярэднюю школу Слонімскага раёна, а Феафанія Садоўская прыехала сюды з Карэліцкага раёна. Усе яны атрымалі залатыя медалі і вось на субяседванні ва універсітэце сустрэліся.

Якім цудоўным здаецца свет і як лёгка дзяліцца сваімі думкамі, калі ведаеш, што ты зрабіў вялікую справу, вытрымаў конкурс на фізмат!

Яны прыйшлі ў БДУ

Ужо які раз адчыняе гасцінна свае дзверы універсітэт перад паступаючымі. Але у гэтым годзе, у адрозненне ад другіх, большасць з іх не дзесяцікласнікі, якія некалькі месяцаў назад пакінулі школьную парту, а юнакі і дзяўчаты з заводаў, калгасаў, лабараторый. Добрымі спецыялістамі павінны стаць яны, бо прыйшлі у ВНУ вернай дарогай, дарогай працы, і прафесію сваю абралі па сапраўднаму прызванню.

У вялікую светлую аўдыторыю сёння увойдзе Іна Каралькова. Яна працавала у арцелі «Калектывіст» мастаком па разрысоўцы шауковых тканін. Неаднаразова прауленне арцелі выносіла ёй падзяку за добрую якасць выпускаемай прадукцыі. Дзяўчына прымала актыўны удзел у грамадскай рабоце, а у вольны час займалася спортам. Зараз І. Каралькова—студэнтка філалагічнага факультэта.

Разам з ёй будзе вучыцца Фаіна Нікіціна, былая пюнерважатая адной з школ Магілёва. Дзякуючы ёй павысілася паспяховасць у школе, сталі рэдкімі выпадкі парушэння дысцыпліны з боку пюнераў. Аб гэтым гаворыць характарыстыка, якую выдалі Фаіне у школе.

Увесь свой летні адпачынак на працягу пяці год заняткаў у школе Э. Шпілеускі праводзіу на калгасным полі. За гэты час у яго кніжцы запісана 423 працадні. Атрымаушы атэстат сталасці, Э. Шпілеускі застаўся у родным калгасе, дзе выдатна працаваў да паступлення ва універсітэт.

Здзейснілася мара і Р. Шлапакова. Яго залічылі на аддзяленне фізікі. Да гэтага ён працаваў у лабараторыі малекулярнай і атамнай спектраскапіі Інстытута фізікі і матэматыкі АН БССР, паспяхова спалучаючы працу з вучобай у вячэрняй школе.

Пасля доўгага перапынку у вучобе прыпшоу ва універсітэт малодшы сержант А. Ванькевіч. Аддзяленне, якім камандаваў ён, перадавое у часці. Дысцыплінаваны сержант, выдатнік вучэбна-баявой падрыхтоўкі А. Ванькевіч меў рад заахвочванняў. Паступаючы ва універсітэт, ён выдатна вытрымаў яшчэ адно выпрабаванне—прыёмныя экзамены на фізіка-матэматычны факультэт.

Студэнтамі сталі В. Арцёменка—былы дырэктар Падстарынскай школы Брэсцкай вобласці, настаунік В. Сафронау, электраманцёр І. Клімау з горада Улан-Батара і многія іншыя. Вось такіх, як яны, лепшых і дастойных, прыняу сёння у сваю сям'ю Беларускі універсітэт.

С. АНЦІПЕНКА.

ЗА ВУЧОБУ!

Да нас прыйшлі першакурснікі.

Хто яны, гэтыя хлопцы і дзяўчаты, якіх мы бачым побач з сабой? Адкуль яны прыйшлі у нашу студэнцкую сям'ю, з якімі думкамі і імкненнямі? З якімі жаданнямі і марамі яны пераступілі парог універсітэта—адной з буйнейшых ВНУ Беларусі?

...Адкрыты, мэтанакіраваны погляд гэтага юнака. Ён глядзіць на субяседніка, размауляе з ім, і здаецца, што чалавек ужо глядзіць на жыццё вопытнымі вачыма.

Мяцельскаму 24 гады. Не прамым і кароткім быу яго шлях у БДУ. Калі сямігодка засталася ззаду, ён вырашыу стаць настаўнікам і паступіу у Пружанскае педагагічнае вучылішча. Прыйшоў час служыць у радах Савецкай Арміі—і ён стаў салдатам. Але і там ён не пакінуу сваю мару і неузабаве паступіу на III курс завочнага аддзялення педагагічнага вучылішча. Пасля дэмабілізацыі, калі працаваў слесарам на адным з заводаў, ён атрымаў дыплом настаўніка пачатковай школы і вярнууся у родную Беларусь.

— Як-жа далей, Міхась?—пыталіся бацькі.

— Вось папрацую гадок, і ва універсітэт,—запэуніу ён.

І вось цяпер мара загадчыка Катранскай пачатковай школы Міхаіла Мяцельскага здзейснілася—ён студэнт філалагічнага факультэта БДУ.

...Экзаменацыйны ліст № 51. Яго уладар Жана Цыркунова. Школу яна закончыла у мінулым годзе, потым працавала. А зараз уступныя экзамены вытрымала паспяхова — у яе 3 адзнакі выдатныя і 2—добрыя.

— Стаць географам—мая мара са школы,—гаворыць дзяўчына.

...Маргарыта Зайцава таксама медалістка, але паступала ва універсітэт на агульных падставах. Набраўшы 24 бала з 25 магчымых, яна заваявала права на залічэнне.

— Усе хваляванні ззаду. Як радасна адчуваць, што праца не прапала дарэмна.

На біялагічны факультэт залічана Дзіна Мілаванава. У сакавіку 1955 года яна паступіла працаваць на падшыпнікавы завод і стала асвойваць спецыяльнасць токара-універсала. Кожную раніцу Дзіна разам з маці спяшалася дадаркі не патрэбны тэхнічныя веды? Сёння, у першы дзень заняткаў, ад імя усіх старшакурснікаў хочацца павіншаваць наша новае папаўненне: і Вадзіма Салаева, рабочага рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, і будучых географаў—электраманцёра станкабудаўнічага завода імя Вараншылава Леаніда Свірноускага і работніка мотавелазавода Валерыя Аношку—і літсупрацоўніка аддзела сельскай гаспадаркі Саветскага раёна Ніны Ціхановіч.



М. МЯЦЕЛЬСКІ. *М. ЗАЙЦАВА.* *Ж. ЦЫРКУНОВА.* *В. КАВАЛЬКОЎ.*

Да запаветнай мары

Нават не верыцца, што запаветная мара пачала здзяйсняцца. Яшчэ займаючыся у сярэдняй школе, я прымаў актыўны удзел у выпуску насценнай газеты. У далейшым, калі стаў студэнтам Буда-Кашалёўскага лесатэхнікума, пачаў пісаць заметкі у абласную газету «Гомельская праўда», у насценнай газеце тэхнікума друкаваў свае першыя вершы.

Дэмабілізаваўшыся з радоў Савецкай Арміі, я працаваў інструктарам Аршанскага райкома комсамола і з першых-жа дзён уключыўся у газетную каляіну. Пісаў аб дасягненнях калгаснікаў, даяраў і свінарак, аб поспехах школьнікаў, выхаванні моладзі. Набываючы вопыт і навыкі ў гэтай справе, я адначасова рыхтаваўся да паступлення ў БДУ на аддзяленне журналістыкі.

І, нарэшце, — я студэнт БДУ. Такім чынам, усё бліжэй да запаветнай мары!

В. КАВАЛЬКОЎ,
студэнт І курса аддзялення журналістыкі.

ГЭТА ЗАСТАНЕЦЦА У ПАМЯЦІ І СЭРЦЫ

МЫ БЫЛІ НА VI СУСВЕТНЫМ ФЕСТЫВАЛІ

Харысты універсітэта



Калона матацыклістаў

Совецкі падрыхтоўчы камітэт VI Сусветнага фестывалю запрасіў каманду матацыклістаў БДУ прыняць удзел у мотапрабегу універсітэтаў СССР, прысвечанаму Свяце юнацтва.

Раніцой 26 ліпеня каманда матацыклістаў БДУ у складзе 13 чалавек стартавала у Мінску.

...700-кілометравы шлях застаўся ззаду. Хвалюючая сустрэча у Маскве... Тут студэнты-матацыклісты універсітэтаў Масквы, Кіева, Кішынёва, Саратава, Рыгі, Харкава, Одэсы, Мінска. Усе яны былі уключаны ў зводную мотакалону, якая рыхтавалася урачыста фінішыраваць на Маскоўскім стадыёне «Дынамо» у дзень адкрыцця спартыўнай часткі фестывалю.

...30 ліпеня. Яркі сонечны дзень. Стадыён «Дынамо» перапоўнен гасцямі. На зялёным полі выстраіліся калоны сцяганосцаў, спартыўныя дэлегацыі краін—удзельніц фестывалю. Урачыстыя гукі фанфар апавясцілі аб пачатку спартыўнага свята.

Спартыўныя спаборніцтвы аб'яўляюцца адкрытымі. Па гарэвай дарожцы ідзе група спартсменаў. Яны нясуць вялікі спартыўны сцяг з эмблемай фестывалю, які быў падняты і рэяў над стадыёнам 10 дзён. Аркестр зайграў «Гімн дэмакратычнай моладзі». У адзіным парыве тысячы гледачоў падымаюцца са сваіх месц і пяюць. Пасля урачыстага марш-парада удзельнікаў спартыўных дэлегацый 45 краін на поле выбягаюць больш 100 юных спартсменаў. Яны у імклівым тэмпе выконваюць складаныя гімнастычныя практыкаванні. Іх змяняюць фехтавальшчыкі і акрабаты, на поле выходзяць вядомыя майстры спорту па гімнастыцы і акрабатыцы.

У перапынку паміж таймамі футбольнага матча пад бурныя прывітанні дзесяткаў тысяч гледачоў на гарэвую дарожку стадыёна выязджаюць у яркіх нацыянальных касцюмах удзельнікі мотапрабегу. Над калонай рэюць сцягі і вымпелы.

— Мір! Дружба!—нясецца на розных мовах з усіх трыбун стадыёна.

Міма цэнтральнай трыбуны праязджаюць матацыклісты Беларускага універсітэта. У калоне—начальнік мотапрабега, выкладчык кафедры гісторыі КПСС В. А. Рабцэвіч, студэнты Г. Кузьмічэнка, Н. Бандарэнка, В. Тузін, Г. Дзятлау, В. Рабцэвіч, А. Еутухова, Г. Праваловіч, Грамовіч, выкладчык кафедры фізвыхавання З. З. Копін. Яны у прыгожых нацыянальных касцюмах, на грудзях—алыя стужкі і эмблемы Сусветнага фестывалю.

На наступны дзень у клубе студэнцкага гарадка МДУ адбыўся вечар сустрэчы удзельнікаў мотапрабегу. Да прысутных звярнуўся адказны сакратар аргкамітэта па правядзенню спартыўных спаборніцтваў моладзі на фестывалі тав. Ванін.

— Ніколі яшчэ Маскоўскі дзяржаўны універсітэт не прымаў у сябе адразу прадстаўнікоў такой вялікай колькасці ВНУ нашай краіны,—сказаў тав. Ванін.—Будзем лічыць гэта пачаткам сапраўднай вялікай дружбы паміж нашымі ВНУ.

Тав. Ванін уручыў камандзе БДУ вымпел, падарунак і дыпломы кожнаму удзельніку мотапрабегу.

...Многа убачылі мы у гэтыя незабыўныя дні. Маскоўскія вуліцы у дні фестывалю нагадвалі рэкі у разводдзе. З раніцы да глыбокай ночы вуліцы Масквы напаўняў яркі людскі паток. Амаль круглыя суткі бульвары, вуліцы і плошчы сталіцы іскрыліся вяселлем і смехам.

Аднаму чалавеку, натуральна, цяжка было пабываць усюды, а хацелася па магчымасці больш дазнацца, пабачыць, пачуць. Хтосьці падлічыў, што для таго, каб аднаму чалавеку пабачыць усё тое, што было у дні фестывалю, трэба затраціць мінімум сто год жыцця. Лічба здаецца незвычайнай. Але, калі мы пазнаёмімся з праграмай фестывалю і III Міжнародных спартыўных гульняў, то пераканаліся у рэальнасці гэтага падліку.

Што выбраць з грандыёзнай праграмы свята, куды пайсці, кожны дзень рашалі мы.

Як можна было, напрыклад, не пабываць на паказе совецкага балету на стадыёне «Дынамо», дзе на вялізнай сцэне у рознакаляровых пралівах святла выступалі лепшыя совецкія балерыны, якія паказвалі урыўкі з лепшых сучасных і класічных балетаў? Ці-ж можна было прапусціць выступленне цудоунага эстраднага канцэрта Югаславіі, непараунальных спевакоу і танцораў Чэхаславакіі, Аргенціны, Чылі? А колькі выдатных спаборніцтваў адбылося на Цэнтральным стадыёне імя В. І. Леніна у Лужніках, дзе на бегавых дарожках, у водным басейне, Палацы спорту, футбольным полі штодзень мераліся сіламі мацнейшыя спартсмены свету!

Маштабы фестывалю былі настолькі вялікія, уражанні ад яго настолькі вялізныя, што напісаць аб усім проста немагчыма. Мне пашанцавала прысутнічаць на выступленні французскага аркестра Мішэля Леграна, які паказваў узоры высокага майстэрства у выкананні джазавай музыкі. Пранікліва, задушэўна выконваў песні Франсіс Лемарк. У суправаджэнні фартэпіяно са сваей нязменнай гітарай у руках ён выконваў песеньку, якія сам напісаў для Іва Мантана.

Увечары 7 жніўня мы усёй групай пайшлі на Ленінскія горы, дзе на плошчах і алеях ля будынка МДУ адбыўся міжнародны студэнцкі карнавал. У нас не было масак і карнавальных касцюмаў. Гэта нас некалькі засмуціла, але да нашай радасці мы даведаліся, што любыя маскі, жартоуныя калпакі, шляпы, стужкі, серпанцін і нават бароды можна было набыць на карнавальным базары. У 9 гадзін вечара пачалося вясёлае карнавальнае шэсце. Эстрадныя аркестры граюць задорную польку, імклівае аргенцінскае самба, вальс...

— Карнаваліта! Карнаваліта!—крычыць стройная дзяўчына і маша камусьці рукой. Да яе падбягаюць смуглыя юнакі. Раздаліся гукі гітары, дроб барабана. Усе захлопалі у далоні і пачауся вясёлы танец.

...Многа добрых сяброў паявілася у нас у гэты незабыўны вечар. Сярод іх Наіра Елабд—студэнтка з Егіпта, Артур Скаргіл—англійскі гарняк, футбалісты Судана і многа, многа іншых. Парыжанін Клод Энзген прыехаў на фестываль разам з жонкай. Старанна падбіраючы французскія словы, я спытаў у яго, ці падабаецца яму Масква, Маскоўскі універсітэт, нашы людзі і само свята юнацтва?

— Чароуна!—адказаў Клод адным словам.

Мы ветліва запрасілі яго сфатаграфавацца разам з намі і у памяць аб нашай сустрэчы падаравалі яму і яго жонцы значкі спартыўнага клуба БДУ.

...Фестывальныя дні падыходзілі да канца. А хацелася яшчэ столькі пабачыць і пачуць. Хтосьці падказаў нам: «Калі вы жадаеце у адным месцы пабачыць прадстаўнікоу амаль усіх краін свету, паязджайце у Цэнтральны парк культуры і адпачынку імя Горкага». І сапрауды, гэта аказалася амаль так. На эстрадзе Зялёнага тэатра парка, на пляцоуках мы пачулі мелодыі галандскіх песень, гучанне акардэонау нямецкага аркестра, пабачылі танцы афрыканскіх неграу і імклівы украінскі гапак...

...За час знаходжання у Маскве мы пабывалі у Трэцьякоускай галерэі, у Крэмлі, музеях, УСГВ...

Адшумелі поуныя хвалюючых падзей незабыўныя дні VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтау у Маскве. Пакідаючы гасцінную сталіцу, нашы замежныя госці кляліся у вечнай дружбе і абяцалі расказаць у сябе на радзіме аб фестывалі у Маскве і совецкіх людзях.

Прабыўшы у Маскве 13 дзён, удзельнікі мотапрабегу стартавалі на Мінск. Зваротны шлях праходзіў праз Падольск, Малы Ярославец, Рославль, Рагачоу, Бабруйск. Ва усіх буйных населеных пунктах матацыклісты праводзілі гутаркі, расказвалі насельніцтву пра святочную Маскву, фестываль, хвалюючыя сустрэчы, пра дружбу моладзі і студэнтау усіх краін.

Па просьбе адказнага сакратара Совецкага падрыхтоўчага камітэта тав. Ваніна праз нашу газету перадаю гарачае прывітанне і найлепшыя пажаданні ў вучобе студэнтам БДУ імя В. І. Леніна ад Міжнароднага студэнцкага клуба.

Р. ТКАЧУК.

НЕЗАБЫЎНА!

— Масква! Фестываль! Гэта—незабыўна!

— Вось мне падараваў кітайскі друг,—гаворыць сябрам студэнт III курса юрыдычнага факультэта Л. Сухаверхі, паказваючы сувенір з відам горада Пекіна.

... На адным з прыгожых праспектаў сталіцы нашай Радзімы сабралася моладзь розных краін. Навокал вяселле, жарты...

— Сняем,—чуецца вясёлы голас Сашы Позняка, студэнта II курса юрыдычнага факультэта, і беларускія студэнты дружна падхапілі «Песню мінскіх студэнтау».

...Цёпла сустрэлі зарубежныя госці і прадстаунікі народау СССР выступленне беларускай мастацкай дэлегацыі, у складзе якой выступаў і наш хор. Але найбольш цёплыя воплескі засталіся у нас ад сустрэч з дэлегатамі Сірыі, Егіпта, Кубы, Інданезіі, Кітая, Карэі, Індыі і многіх іншых краін. Няхай мы не ведалі іх мовы, але усе мы добра ведалі два словы: «Мір!», «Дружба!».

Ніколі не забыць нашым студэнтам сяброўскай сустрэчы з аустрыйскімі дэлегатамі. Мы разам ехалі у адным аутобусе. Завязалася ажыуленая гутарка. Шанцавала таму, хто ведаў нямецкую мову. Хтосьці запеў студэнцкую песню «Гаудыамус», і яе дружна падхапілі усе. Потым разам з аустрыйцамі мы пелі на рускай мове «По долинам и по взгорьям», «Ой, Самара-городок» і іншыя песні. Разам з членамі аустрыйскай дэлегацыі рабочай моладзі мы наведалі студэнцкі гарадок сельскагаспадарчай акадэміі імя Тімірязева, гулялі па вуліцах Масквы.

А вось яшчэ цікавая сустрэча.

— Вы з Карэі?—запыталі нашы студэнты, сустрэўшы зарубежных гасцей.

— Кітай,—пачулася у адказ.

— Вось і пагавары ты з імі па-кітайску,—са смуткам сказала Маша Пугачова.

Госці усміхнуліся і перагледзеліся паміж сабой.

— А што, вы ведаеце рускую мову?—узрадавалася Маша.

На самай справе, нашы кітайскія сябры свабодна гаварылі па-руску, і нашай сардэчнай размове не было канца.

За час знаходжання у Маскве нашы студэнты пабывалі на нацыянальных канцэртах прадстаўнікоу Бельгіі, Англіі, Інданезіі, Францыі, Балгарыі і іншых краін. Многія былі сведкамі напружаных спаборніцтваў па рэгбі і футболу. Ды хіба-ж можна перадаць ўсё тое, што давялося нам пабачыць на фестывалі? Не, гэта немагчыма!

...Урачысты нацыянальны канцэрт беларускай мастацкай дэлегацыі ў тэатры імя Станіслаускага і Неміровіча-Данчанкі. Паслухаць і паглядзець канцэрт беларускай дэлегацыі прыйшлі прадстаунікі дзесяткаў краін, брацкіх рэспублік СССР. Пяюць, танцуюць беларусы... Канцэрт падыходзіць да канца. Нечакана паяуляецца цудоўны аутобус. Ён прывёз букеты, адкрыткі, сувеніры, падрыхтаваныя беларусамі у падарунак гасцям—удзельнікам VI Сусветнага фестывалю. Звыш 300 удзельнікаў канцэрта беларускай дэлегацыі на сцэне. Яны трымаюць у руках букеты, у кожны з якіх укладзена адкрытка з самымі запаветнымі пажаданнямі дарагім сябрам і сяброукам з усяго свету.

Гучыць «Гімн дэмакратычнай моладзі». На розных мовах гучыць заклік да міру і дружбы паміж народамі ўсяго свету. Гэты заклік вырываецца за каменныя сцены тэатра і па эфіру аблятае увесь свет. Пад бурныя апладысменты прысутных беларускія юнакі і дзяўчаты спускаюцца са сцэны і уручаюць сваім сябрам з Кітая і Інданезіі, Індыі і Карэі, Італіі, В'етнама і многіх іншых краін букеты кветак.

У гэты дзень доуга яшчэ мы гутарылі са сваімі сябрамі, абменваліся значкамі, сувенірамі. А на вуліцах горада юнацкага свята амаль да самай раніцы не змаукалі дарагія сэрцу кожнага юнака і дзяўчыны словы: «Мір!», «Дружба!».

І. СТАРАВОЙТАЎ,
П. ЧАРНУХА,
удзельнікі VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтау.

Удзельнікі хору БДУ на цэнтральным скверы Маскоускага універсітэта.

Негры, французы, беларусы—усе сталі братамі на фестывалі.

Вынікі работы прыёмнай камісіі

Перад прыёмнай камісіяй у бягучым годзе стаяла складаная і сур'ёзная задача—з вялікай колькасці паступаючых адабраць кандыдатаў, найбольш падрыхтаваных, найбольш дастойных і адказваючых профілю рыхтуемых універсітэтам спецыяльнасцяў.

Вынікі набору новага папаўнення студэнтаў у бягучым годзе сведчаць аб паспяховым выкананні прыёмнай камісіяй БДУ паставленай перад ёй задачы. На 560 месц па універсітэту залічана 159 медалістаў, з іх 54 чалавека з залатымі медалямі. Пры гэтым трэба адзначыць, што у адпаведнасці з нормай, устаноуленай вышэйстаячымі органамі, па-за конкурсам залічана толькі каля паловы паступаючых медалістаў з залатымі медалямі і каля 25 працэнтаў медалістаў з сярэбранымі медалямі. Найбольш высокі працэнт медалістаў аказауся на аддзяленнях фізікі, матэматыкі.

Характэрнай асаблівасцю складу новага папаўнення студэнтаў гэтага года з'яуляецца высокі працэнт асоб, якія маюць стаж работы не менш двух год пасля заканчэння сярэдняй школы на прадпрыемствах, у калгасах, у совецкіх установах, а таксама дэмабілізаваных з радоу Совецкай Арміі. Па-за конкурсам на гэтых асновах залічана 179 чалавек, у тым ліку па факультэтах: гістарычным—29, філалагічным—59, юрыдычным—43, біялагічным—15, фізіка-матэматычным—19, хімічным—7, геаграфічным—7 чалавек.

З прыведзеных даных бачна, што на некаторых факультэтах асобы, якія маюць працоуны стаж вышэй двух год, і дэмабілізаваныя, складаюць звыш паловы залічаных студэнтаў.

Так, прынятыя на аддзяленне журналістыкі таварышы маюць стаж практычнай журналісцкай дзейнасці не менш двух год. Гэта гаворыць аб тым, што сярод залічаных няма людзей выпадковых, што усе гэтыя таварышы даказалі на практыцы не толькі сваю прыхільнасць да абранай імі спецыяльнасці, але і свае здольнасці.

Тое-ж самае можна сказаць аб большасці залічаных на іншыя факультэты. Напрыклад, на юрыдычны факультэт паступілі такія таварышы, як І. Науменка, член КПСС, дэмабілізаваны з Совецкай Арміі у званні капітана; П. Вараб'ёу, які 10 год служыу у Совецкай Арміі; Т. Лагун, А. Пашкевіч, В. Халецкая, Г. Шырокова, якія працавалі у судовых органах.

Да паступаушых ва універсітэт у бягучым годзе прад'яуляліся высокія патрабаванні. Аднак таварышы паказалі на экзаменах веды, якія поунасцю адпавядаюць гэтым патрабаванням.

В. С. КАРПІК,
член прыёмнай камісіі.

БУДЗЕМ ВЕЧНЫМІ СЯБРАМІ

15 жніуня, гэты будзённы дзень, быу вялікім святам для жыхароу сталіцы Беларусі.

Шчырая размова. Ці не прауда?

Раніцой сотні мінчан — пажылыя, маладыя і самыя юныя — сабраліся на прывакзальнай плошчы. Яны прыйшлі для таго, каб сустрэць поезд з зарубежнымі гасцямі, якія вяртаюцца на радзіму з Маскоускага фестывалю, Сусветнага фестывалю міру і дружбы.

Вось і фестывальны поезд падыйшоу да перона. Каля 1000 зарубежных гасцей выйшлі з вагонау і змяшаліся з мінчанамі. На Прывакзальнай плошчы выстраіліся аутобусы. Сюды і накіраваліся дарагія госці зямлі Беларускай пасля урачыстага мітынгу—палякі, немцы, пасланцы Пакістана, Кіпра, Іспаніі, Ганы, Нігерыі, Сурынама і іншых краін. А праз гадзіны дзве, калі праспект імя Сталіна засвяціуся сонечнымі праменнямі, прабіушыміся скрозь абрыукі хмар, зарубежныя госці сталі знаёміцца са сталіцай Беларусі. Па усмешках дэлегатау, па іх ажыуленых тварах можна было здагадацца—наш любімы горад спадабауся замежным юнакам і дзяучатам. Ды і ці магло быць інакш? Нават карэнным мінчанам, на вачах якіх прыгажэе горад, ён заусёды цікавы і юны.

І што характэрна для гэтай сустрэчы: спачатку мінчане проста віталі дарагіх гасцей, выстраіушыхся уздоуж праспекта, а потым сотні гаражан улілися у калону іншаземцау і так ішлі з імі да Круглай плошчы.

Студэнты абкружылі маладога іспанца і нешта, збіваючыся, імкнуцца сказаць яму. Госць ухмыляецца. Як хочацца сказаць яму хоць некалькі слоу на мове, на якой гаварыу Ленін, але пакуль ён ведае толькі два словы: «Дружба» і «Мір». І гэтыя словы паутараюцца на дзесятках мовау людзьмі розных народау.

Малады кіпрыёт Костас Пападаскіс ідзе побач з двума сваімі сябрамі. Раптам ён пачуу англійскую мову ад незнаёмкі.

— Хто вы?

— Мінчанка. Валянціна Горава.

Завязалася ажыуленая гутарка. Валянціна бойка размауляе на англійскай мове і задае дзесяткі пытанняу. Кіпрыёт ахвотна адказвае на іх. Сам ён нарадзіуся на Кіпры, але вучыцца там не змог, паехаў у Англію, паступіу у адзін з каледжау, але потым давялося ісці працаваць.

Маленькай мінчанке не церпіцца пастукаць у бубен.

— Кім? — перапытвае Костас. І мінуту-дзве памаучаушы, працягвае, — у рэстаране, «хлопчыкам». Атрымліваю 8 фунтаў стэрлінгау у тыдзень. Два з іх аддаю за кватэру. А каб больш-менш пракарміцца, трэба заплаціць паутара фунты стэрлінгау у дзень. Вось так і жыву.

А непадалёку ад гэтай групы, што ідзе з кіпрыётамі, упэунена крочыць па беларускай сталіцы негр Альфрэд Самсон.

— Спадабаецца Вам Мінск?—пытаемся у яго.

— О, да! — адказвае Альфрэд і дабауляе.—І народ добры.

Падыходзіць перакладчык і тады кожны, хто стаяу у гэтай групе, пачуу многа цёплых, задушэуных слоу аб Мінску і мінчанах. Гэтыя словы гаварыу наш чарнаскуры сябра Альфрэд Самсон.

...Зноу чуваць гукі маторау. Госці накіроуваюцца да аутобусау. Адны з іх едуць на аутамабільны завод, другія—да трактаразаводцау. Але паспрабуй уехаць, калі вакол аутобуса многа ветлівых гаспадароу—маладых мінчан.

Галіна і Аляксей Кагадаевы утульна размясціліся у 12-м аутобусе і ажыулена гутараць з пасланцамі ГДР. Аляксей—аспірант Ленінградскай кансерваторыі — добра размауляе на нямецкай мове. А горнарабочы Ульрых Лінднер крыху ведае рускую мову. Вось і гавораць яны пра усё, што іх цікавіць. А потым супругі Кагадаевы даруюць свайму новаму знаёмаму паштоуку з надпісам: «Дарагому сяброу нашай сустрэчы».

... Трактаразаводцы цёпла сустрэлі дэлегатау нямецкай моладзі. Госці уважліва разглядаюць прадукцыю трактаразаводцау. Гізберт Хедыке, работнік вагонабудаўнічага завода з горада Гале, хлопае па плячу комсамольца Анатолія Тамковіча:

— Ты робіш трактары, а я—вагоны,—гаворыць ён.—Мы—мірныя людзі.

Як добра далёка ад радзімы пачытаць газету на роднай мове.

Госці задаволены.

Над рабочым пасёлкам пранесліся гукі фанфар—гэта аркестр фанфарыстау пачаў свой кароткі канцэрт. Усяго некалькі маршаў выканалі нямецкія музыканты, але трактаразаводцы засталіся задаволенымі сваімі новымі сябрамі.

Зноу госці у аутобусах. Маша рукой Рыта Хеншке, работніца абутковай фабрыкі горада Магдэбурга. Студэнты універсітэта Георгі Барысау і Альберт Дароускі адказваюць ёй. Яны толькі што абмяняліся аутографамі, а зараз ветліва праводзяць сваю новую знаёмую.

Гансу Мешэнду пашанцавала. У яго руках пачка паштовак і на адной з іх напісана: «Будзем вечнымі сябрамі». Што можа быць прыгажэй гэтых слоу, сказаных маладымі людзьмі, слоу, якія ішлі ад глыбіні душы і напісаны ад усяго сэрца!

Пакуль пасланцы Польшчы і іншых краін знаходзіліся у піонерскім лагеры трактарнага завода, нямецкія дэлегаты пабывалі у Ждановічах таксама у піонерскім лагеры. Старшая піонерважатая Неля Собалева, студэнтка гістарычнага факультэта нашага універсітэта, расказала гасцям, якія умовы створаны для адпачынку дзяцей у лагеры.

Развітваючыся з піонерамі, прадстаунік дэлегацыі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Ульрых Барцок сказау:

— Дарагія дзеці, мы зрабілі вялікае падарожжа. У горадзе VI Сусветнага фестывалю, цудоунай Маскве, сустрэлася моладзь усяго свету. Там юнакі і дзяучаты пакляліся заусёды змагацца за мір. Вы, піонеры—цудоуныя кветкі цудоунага Совецкага Саюза, следуйце запавету Уладзіміра Ільіча Леніна: «Вучыцеся, вучыцеся і вучыцеся».

Вечарам у Палацы культуры профсаюзау і Акруговым Доме афіцэрау адбыліся сустрэчы гасцей з моладзю Мінска, а потым мінчане сардэчна праводзілі зарубежных гасцей.

Г. МІХАЙЛАЎ.

— Такіх машын мы нідзе не бачылі,—гаварылі негры з Заходняй Афрыкі.

КЛІЧАМ ВАС, СЯБРЫ!

* * *

Прыходзьце ў нашы калектывы!

Пачатак навучальнага года! Не для усіх студэнтаў нашага універсітэта гэтыя словы маюць аднолькавы сэнс. Для адных—гэта пачатак наступнага года вучобы, для другіх—апошні год, а для першакурснікаў, якія сёння прыйшлі на заняткі, пачатак новага навучальнага года азначае пачатак зусім новага для іх жыцця—жыцця студэнтаў вышэйшай навучальнай установы. Але галоўнае для усіх—зноў пачынаецца багатае, рознастароннае жыццё, жыццё нашага вялікага, дружнага студэнцкага калектыву.

Як старшыня праўлення клуба хачу асабіста звярнуцца да студэнтаў першых курсаў. Пачатак навучальнага года азначае і пачатак работы калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта. У ближэйшыя дні пачнуцца рэгулярныя рэпетыцыі хора, аркестра народных інструментаў, танцавальнага і драматычнага калектываў, духавога аркестра, гуртка салістаў-вакалістаў і іншых.

Сярод студэнтаў новага набору ёсць много юнакоу і дзяучат, якія любяць самадзейнасць і раней прымалі удзел у тым або іншым калектыве, або маюць схільнасць да таго ці іншага жанру самадзейнасці. Мы усіх клічам уступіць у нашы калектывы, дадатковы набор у якія будзе праводзіцца да 10 верасня.

У гэтым годзе наш народ будзе адзначаць вялікае свята—40-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. Паспяхова падрыхтавацца да гэтай знамянальнай даты—абавязак нашай самадзейнасці, і чым хутчэй мы папоунім калектывы, пачнем іх сістэматычную работу, тым лепш мы падрыхтуемся да свята. Заклікаем усіх студэнтаў першых курсау уступіць у нашы калектывы мастацкай самадзейнасці.

Г. ГЕРАСІМЕНКА,
старшыня праўлення клуба.

Займайцеся спортам!

У прайшоўшым навучальным годзе калектыу фізкультуры універсітэта арганізацыйна узмацніуся. Зараз членамі спартыунага клуба БДУ з'яуляюцца 2 114 студэнтаў і навуковых работнікау.

Нямала цікавых мерапрыемстваў было праведзена спартыуным клубам універсітэта у мінулым навучальным годзе. Нашы баскетбалісты выйшлі пераможцамі у сустрэчах з баскетбалістамі Саратава, Казані, Ленінграда. Лёгкаатлеты, удзельнічаючы у свяце, прысвечаным 87-годдзю з дня нараджэння В. І. Леніна у горадзе Казані, занялі першае месца у спаборніцтвах ВНУ краіны. Баскетбалісты БДУ прымалі у сябе каманду з горада Днепрапятроўска і выйшлі пераможцамі.

На другой Усебеларускай спартакіядзе спартсмены БДУ занялі першыя месцы па лёгкай атлетыцы, ручному мячу, баскетболу, валейболу (жаночая каманда) і занялі агульнае 2-е месца сярод ВНУ рэспублікі.

Праўленне спартыунага клуба удзяляе вялікую увагу развіццю турызма і альпінізма. Зараз дзве групы студэнтаў знаходзяцца у альпінісцкім паходзе на Алтаі і турысцкім—на Каўказе.

Мы распрацавалі рад спартыуных мерапрыемстваў для студэнтаў першых курсаў. У верасні адбудзецца розыгрыш першынства першых курсау па валейболу і баскетболу, у выхадныя дні будуць праводзіцца аднаднеуныя турысцкія паходы, а таксама адборачныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы і інш.

Задачай спартыунага клуба з'яуляецца усебаковае фізічнае развіццё студэнтаў, павышэнне іх спартыунага майстэрства.

Таварышы першакурснікі! Прыходзьце ў нашы спартыуныя секцыі! Абавязкова займайцеся спортам!

М. А. ШЭЙНЕМАН,
старшыня праўлення спартыунага клуба БДУ.

НА КАФЕДРАХ, У КАБІНЕТАХ, ЛАБАРАТОРЫЯХ

У гэтым навучальным годзе на фізіка-матэматычным факультэце ствараюцца дзве новыя кафедры: вылічальнай матэматыкі, начале з прафесарам В. І. Крыловым, і па фізіцы цвёрдага цела і поуправаднікоу, якой будзе загадваць прафесар Н. Н. Сірата. Кафедры набылі ужо некаторыя устаноўкі і вымяральныя прыборы. Чакаецца прыбыццё электронна-вылічальнай машыны «Урал».

* * *

Пяцікурснікі хімфака ўпершыню у новым навучальным годзе будуць слухаць курс «Выбраныя главы з неарганічнай хіміі» і курсы «Хімічнай тэрмадынамікі» і «Хіміі і фізіцы хіміі ізатопаў». Па гэтых курсах арганізуюцца спецыяльныя практыкумы.

На факультэце атрымана абсталяванне для радыёхімічнай лабараторыі.

* * *

Для студэнтаў-біёлагаў V курса ў новым годзе будуць чытацца новыя курсы біяфізікі і радыёбіялогіі. Мяркуецца увесці раздзельнае чытанне курсаў біяхіміі раслін і біяхіміі жывёл.

Лабараторыі папоўніліся мікраскопамі новых марак, у тым ліку стэрэаскапічнымі бінакумернымі мікраскопамі маркі «ЖВС-2».

Арганізацыя лабараторый мікрабіялогіі, цыталогіі і генетыкі, лабараторыі школьнага эксперыменту з-за адсутнасці памяшкання пакуль затрымліваецца.

* * *

Сёлета значна ўзбагацяцца геаграфічны і геалагічны кабінеты. Набыты глобусы, атласы, картаграфічныя матэрыялы, падрыхтаваны геалагічныя вучэбныя ўзоры. Арганізаваны і часткова абсталяваны кабінет па асновах прамысловай сельскагаспадарчай вытворчасці.

* * *

Добра падрыхтаваўся да новага навучальнага года кабінет палітэканоміі. Ён папоўніўся навейшай палітыка-эканамічнай літаратурай, наглядным дапаможнікамі, альбомамі. Студэнты змогуць атрымаць тут творы класікаў марксізма-ленінізма, статыстычныя зборнікі «Прамысловасць СССР», «Народная гаспадарка СССР», «Фінансы і крэдыт СССР» і іншыя, а таксама розныя брашуры па тэмах курса палітычнай эканоміі. У час заняткаў у кабінеце студэнты змогуць карыстацца і перыядычнай літаратурай, якая прадстаўлена тут вельмі багата.

В. а. рэдактара Г. ПАРОМЧЫК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 01589 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 933 Тыраж 2000